Падтрымай "Вясну" на PATREON

Ператрусы, допыты, затрыманні. Хроніка пераследу 8 верасня дапоўнена

08.09.2020 **Тэгі**: пераслед, следчы камітэт



Затрыманне на пр-це Машэрава. Фота TUT.BY

Супрацоўнікі Следчага камітэту раніцай 8 верасня прыйшлі па месцы жыхарства актывіста "Маладога фронту" **Віталя Трыгубава.** Аднак дома яго не было. Маці запыталася праз дзверы ў следчага, чаму той цікавіцца Віталём. Той паведаміў, што хоча дапытаць Трыгубава ў межах крымінальнай справы узбуджанай нібыта па ч.1 арт. КК 339 («хуліганства»).

Праваабаронцам таксама паведамляюць, што раніцай перастаў выходзіць на сувязь і лідэр "Маладога фронту" **Дзяніс Урбановіч.** Магчыма яго затрымалі.

Тэлеграм-канал Беларускай асацыяцыя журналістаў паведамляе, што сілавікі спрабуюць трапіць у кватэру, дзе жывуць журналісты TUT.BY **Галіна Уласік** і яе дачка **Валерыя Уласік.** Паведамляецца, што ёсць санкцыя пракурора на пратрус. Пра гэта БАЖу распавялі самі журналісткі. Сілавікі

затрымалі **Валерыю Уласік** па абвінавачанні ва ўдзеле ў несанкцыянаваным мерапрыемстве (адміністрацыйная справа). Пра гэта піша TUT.by са спасылкай на словы яе маці **Галіны Уласік**.

З учорашняга дня каля кватэры, дзе жыве сябра рады «Экадом» **Ксенія Малюкова**, дзяжураць невядомыя, паведамляе Радыё Свабода.

> *«Яны пачалі дзяжурыць каля кватэры з 14:00 учора. Паўдня грукалі ў дзьверы, дома быў мой хлопец, ён не адчыняў. Дзяжурылі ўначы і раніцай, міліцыя пазваніла дзяўчыне – уласьніцы кватэры і сказалі, што прыйдуць з ператрусам у 14:30; калі дзьверы не адчыняць — выламаюць»,* — паведаміла Свабодзе Ксенія.

Таксама невядомыя з раніцы спрабавалі трапіць у кватэру, дзе жыве дырэктарка «Экадому» **Марына Дубіна.**

> *«Сёньня каля 7 гадзінаў раніцы пачалі барабаніць у дзьверы, потым я пабачыла, што гэта 3 чалавекі ў цёмнай вопратцы, пэрыядычна яны дзяжурылі пад вокнамі, на працягу некалькі гадзінаў моцна грукалі ў дзьверы. Калі яны на некаторы час адышлі, мне ўдалося сысьці»*, — расказала Марына Дубіна.

Таксама сёньня міліцыя прыйшла з аглядам жыльля дачкі Ірыны Сухій — **Соф'і Садоўскай.** Самой Соф'і дома не было, яны прыйшлі наконт яе ўдзелу ў «несанкцыянаванай акцыі».

Супрацоўнікі міліцыі працягваюць затрымліваць удзельнікаў студэнцкіх акцый пратэсту. Сярод затрыманых студэнт БДТУ **Дзмітрый Сінюк**. Да гэтага яму тэлефанавалі, каб "проста пагаварыць". Ён сам гэта звязвае з падзеямі 9-12 жніўня. Паведамляецца таксама, што ён быў затрыманы ў Брэсце.

У сябе дома ў Мінску затрыманы **Іван Васілюк**, праз некалькі гадзін яго вызвалілі.

Затрыманая ў нядзелю давераная асоба Святланы Ціханоўскай **Антаніна Канавалава** пасля суда над ёй не выйшла на волю. Увечары яе знаёмым пацвердзілі, што жанчына знаходзіцца ў ізалятары на Акрэсціна. Антаніна зноў затрымана, але ўжо ў межах крымінальнай справы.

У Бабруйску затрымалі журналіста і праваабаронцу **Сяржука Лацінскага** Сяржук мусіць адбыць 7 сутак, якія у яго засталіся пасля затрымання 19 чэрвеня 2020 года на пікеце салідарнасці.

Суд Бабруйскага раёна і горада Бабруйска пастанавіў, што Сяржук Лацінскі — журналіст і назіральнік БХК, сваёй прысутнасцю на акцыі “жывы ланцуг” 19 чэрвеня парушыў заканадаўства аб масавых мерапрыемствах.

Тады ён быў пакараны за парушэнне арт. 23.34 КаАП 10 суткамі арышта, але адбыў толькі трое, бо захварэў. Цяпер Сяржука затрымалі, каб ён адбыў увесь тэрмін арышту.

Увечары 8 верасня ў Мінску каля Камароўскага рынку, а таксама на пр. Машэрава адбыліся затрыманні ўдзельнікаў акцыі ў падтрымку Марыі Калеснікавай. Публікуем спіс затрыманых:

1. **Адзярыха Вячаслаў**
2. **Арцёменкава Алена**
3. **Атакулава Маўлюда**
4. **Бернат Паліна**
5. **Брацянкова Святлана**
6. **Бурачэўская Алена**
7. **Бялінская Таццяна**
8. **Вагнер Уладзімір**
9. **Відунова Юлія**
10. **Высочына Вікторыя** - павезлі ў РУУС Першамайскага раёна.
11. **Гайдучонак Фёдар**
12. **Гамеза Сяргей**
13. **Гапаненка Аляксей**
14. **Гарбуноў Кірыл**
15. **Гаспадарык Кацярына**
16. **Гетц Іван**
17. **Грыгор'еў Дзмітрый**
18. **Гулеўскі Павел**
19. **Гурло**
20. **Давыдаў Філіп**
21. **Данілаў Ілля**
22. **Дзмітрыева Дар'я**
23. **Дубовік Валянцін**
24. **Завараў Максім**
25. **Загнетаў Мікіта**
26. **Ільчанка**
27. **Кавалеўская Ганна**
28. **Кажэўнікаў Дзмітрый**
29. **Казак А.**

30. **Калнібароцкая Эліна**
31. **Каровін Юрый**
32. **Каўцэвіч Дзмітрый**
33. **Кашмель Аляксандр**
34. **Кляшчова Фаіна**
35. **Комар Ганна**
36. **Кунцвіч Сяргей**
37. **Ластоўская Кацярына**
38. **Ліпай Наталля**
39. **Лішык Алег**
40. **Лук'янаў Аляксей**
41. **Львова Аліна**
42. **Лябедзіч Анастасія**
43. **Ляднёва Ксенія**
44. **Ляднёва Паліна**
45. **Лянкевіч Уладзь**
46. **Ляўданскі Антон**
47. **Ляўчук Яўген**
48. **Майсяёнак Аляксей**
49. **Макарэвіч В.**
50. **Макрацова Галіна**
51. **Маліноўская Ю.**
52. **Мамуль Аксана**
53. **Мартынчік Дзмітрый**
54. **Марухін Аляксей**
55. **Матусевіч Ілля**
56. **Мядзведзеў Сяржук**
57. **Наўмовіч Кірыл**
58. **Несцяронак Аляксандр**
59. **Нікіцін Яўген**
60. **Насенка Віталь**
61. **Новікава Інга**
62. **Някрасаў Ігар**
63. **Папко Павел**

64. **Папоў Ілля**
65. **Петухова Алена**
66. **Петухова Наталля**
67. **Пятровіч Наталля**
68. **Пузан Мікіта**
69. **Рабека Іван**
70. **Рабецкая Анастасія**
71. **Рубанаў Іван**
72. **Сабадаха Вадзім**
73. **Сабалеўскі Іван**
74. **Савісцюк Дзяніс**
75. **Салук Наталля**
76. **Самойленка Аляксандр**
77. **Сіроцін А.**
78. **Снегірова Аляксандра**
79. **Стасіловіч Віталь**
80. **Страцкевіч Уладзімір**
81. **Стэфановіч О.**
82. **Сударь Андрэй**
83. **Сыцько Анатоль**
84. **Сярко Андрэй**
85. **Сярко Іван**
86. **Тананко Міхаіл**
87. **Толак Кірыл**
88. **Трушкін Яўген**
89. **Тубан Мікіта**
90. **Урублеўская Н.**
91. **Філіпава Яна**
92. **Халецкая Алена Аляксееўна,** 1957 год нараджэння
93. **Хамяк Кацярына**
94. **Хмялеўскі Мікалай**
95. **Хораў Алег**
96. **Цало І.**
97. **Цітавец Дзмітрый**

98. **Чорны Радзівон**
99. **Чыркоў Андрэй**
100. **Шаўцоў Яўген**
101. **Шах Антон**
102. **Шкалякоўскі Сцяпан**
103. **Шкраба Міхаіл**
104. **Шпак Дзмітрый**
105. **Шупейка Алег**
106. **Шылай Паліна**
107. **Юдчыц Генрыета**
108. **Янаў А.**

Таксама ўвечары ў Берасці побач з ЦУМам меўся адбыцца ланцуг салідарнасці з нагоды Дня беларускай вайсковай славы , прыйшла невялікая група жанчын, Затым пад'ехаў аўтазак. А 19:00 затрыманы журналіст **Максім Хлябец.** Зараз ён дае тлумачэнні ў Брэсцкім РАЎС.

Твитнуть







Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных

Бабруйчаніна будуць судзіць за "публічныя заклікі да арганізацыі мітынгу". Распавядаем, што гэта за артыкул

"Не менш за 100 000 чалавек укрыліся за мяжой". Выйшаў даклад УВКПЧ ААН пра сітуацыю ў Беларусі (дакумент)

WWW.GAZETABY.CO

ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА



Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур'ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"

У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў



ГАЛОЎНАЕ

Без зменаў. Адбылася апеляцыя па справе "Вясны"


#ВолюВясне


ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗНЯВОЛЕНЫЯ
Спіс палітычных вязняў

АПОШНІЯ НАВІНЫ

Заява праваабаронцаў аб прызнанні 11 палітычных зняволеных

Старэйшыну баптысцкай царквы “Новая Зямля” Андрэя Мамойку і яго жонку Веру асудзілі да “хатняй хіміі”

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Шэсць еўрапейскіх парламентарыяў сталі "хроснымі" для беларускіх палітвязняў

Да 20 гадоў калоніі: фігурантам "справы Nexta" запрасілі тэрміны

Затрыманне футбольнага фаната, новы "тэрарыст": хроніка пераследу 21 красавіка (дапоўнена)

Былога ўчастковага асудзілі да 6 гадоў калоніі па справе "Чорнай кнігі Беларусі"

"Не хацелася, каб хтосьці трапляў туды". Экс-палітзняволены Аляксандр Бабко распавёў пра пераслед па "справе цюкоў"

Затрыманні ў Брэсце і Віцебску пасля рэйда па сансетках: хроніка пераследу 20 красавіка

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік 2023







ПАРТНЁРСТВА

СЯБРОЎСТВА

























E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY